*4.* Об утверждении Положения о детском доме семейного типа [Электронный ресурс] : постановление Совета Министров Респ. Беларусь, 28 февр. 2006 г., № 289 : в ред. постановления Совета Министров Респ. Беларусь от 25.04.2016 г. // ЭТАЛОН. Законодательство Республики Беларусь / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2017.

*5. Ослон, В. Н.* Жизнеустройство детей-сирот: профессиональная замещающая семья / В. Н. Ослон. – М. : Генезис, 2006. – 368 с.

*6. Позднякова, Ю. В.* Понятие «замещающая семья» в России: сущность и содержание / Ю. В. Позднякова // Вестн. Ун-та Рос. акад. образования. – 2011. – № 5. – С. 83–84.

*7. Поспелова, Н. С.* Педагогические условия профилактики социального сиротства: на материале раннего выявления неблагополучных семей : автореф. дис. … канд. пед. наук : 13.00.01 / Н. С. Поспелова ; Белорус. гос. пед. ун-т. – Минск, 2006. – 21 с.

***Ж. Л. Раманава,***
*кандыдат педагагічных навук,*
*старшы выкладчык кафедры тэорыі і гісторыі*
*інфармацыйна-дакументных камунікацый*

## ІНФАРМАЦЫЙНА-АДУКАЦЫЙНЫЯ РЭСУРСЫ ПУБЛІЧНЫХ БІБЛІЯТЭК

Публічныя бібліятэкі – адзін з тыпаў бібліятэк, які вызначаецца ў адпаведнасці з іх сацыяльным прызначэннем і характарызуецца ўніверсальным складам фондаў і прызначаны для задавальнення агульных чытацкіх патрэбнасцей шырокага кола карыстальнікаў. Фонды публічных бібліятэк утрымліваюць інфармацыйныя рэсурсы мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства, якія прызначаны для задавальнення як патрэбнасцей, звязаных з правядзеннем вольнага часу, так і адукацыйных і самаадукацыйных патрэбнасцей. Гэта звязана з вывучэннем мастацкай літаратуры ў сярэдніх, сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных установах. Такім чынам, інфармацыйныя рэсурсы мастацкай літаратуры, якія ўтрымліваюць творы з вучэбных праграм і праграм пазакласнага чытання, можна з поўным аснаваннем аднесці да інфармацыйна-адукацыйных рэсурсаў публічных бібліятэк. Увогуле, калі разглядаць публічныя бібліятэкі нізавога ўзроўню (гарадскія, сельскія, горпасялковыя, дзіцячыя і інш.), фонды якіх на 50–60 % складае мастацкая літаратура, то можна адзначыць, што менавіта інфарма-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цыйныя рэсурсы мастацкай літаратуры складаюць асноўны масіў іх інфармацыйна-адукацыйных рэсурсаў.

Акрамя гэтага, да інфармацыйна-адукацыйных рэсурсаў адносяцца рэсурсы літаратуразнаўства. У першую чаргу гэта вучэбныя рэсурсы, прызначаныя для забеспячэння адукацыйнага працэсу, сістэма якіх адрозніваецца жанравай разнастайнасцю і розным чытацкім адрасам. Сярод іх вылучаюцца падручнікі па мастацкай літаратуры, вучэбныя дапаможнікі, хрэстаматыі, кнігі для чытання, вучэбна-метадычныя комплексы, курсы лекцый, рабочыя сшыткі, сачыненні і інш. У адукацыйных мэтах таксама шырока выкарытоўваюцца навуковыя літаратуразнаўчыя (манаграфіі, зборнікі навуковых артыкулаў, матэрыялы канферэнцый, зборы твораў літаратуразнаўцаў і інш.), даведачныя (літаратурныя і персанальныя энцыклапедыі, слоўнікі, тэрміналагічныя, біяграфічныя даведнікі, слоўнікі мовы пісьменнікаў, літаратурныя хронікі і інш.), навукова-папулярныя рэсурсы.

Нягледзячы на тое, што інфармацыйна-адукацыйныя рэсурсы мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства складаюць даволі значную частку галіновых інфармацыйных рэсурсаў і шырока прадстаўлены ў фондах публічных бібліятэк, асноўныя тэарэтычныя пытанні, звязаныя з іх вывучэннем, не распрацаваны. Бачыцца неабходным спыніцца на праблеме дэфініцыі і функцый азначаных рэсурсаў.

На сённяшні момант існуюць азначэнні інфармацыйных рэсурсаў мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства, а таксама інфармацыйна-адукацыйных рэсурсаў, на падставе якіх намі прапануецца дэфініцыя даследуемых рэсурсаў. Інфармацыйныя рэсурсы мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства азначаюцца як сукупнасць мастацка-вобразных і навуковых ведаў, замацаваных на розных матэрыяльных носьбітах для іх трансляцыі і ажыццяўлення эстэтычнай і навуковай камунікацыі ў грамадстве [1, с. 8]. Інфармацыйна-адукцыйныя рэсурсы, на думку Т. С. Юхнавец, большасць даследчыкаў азначае з пазіцый дакументнага падыходу як «дакументы, прызначаныя для задавальнення інфармацыйных запатрабаванняў адукацыйнага характару», «дакументныя крыніцы ў электроннай форме, прызначаныя для дасягнення адукацыйных мэт» [2, с. 6]. Акрамя гэтага, інфармацыйна-адукацыйныя рэсурсы з пазіцый кагнітыўнага падыходу дэфінуюцца як «сукупнасць ведаў, сабраных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і структураваных па пэўных правілах і з ужываннем спецыяльных тэхналогій» [2, с. 2].

У адпаведнасці з гэтымі падыходамі мэтазгодным бачыцца азначэнне інфармацыйна-адукацыйных рэсурсаў мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства як сукупнасці мастацка-вобразных і навуковых ведаў, замацаваных на розных матэрыяльных носьбітах, якія з'яўляюцца сродкам адукацыі і прызначаны для дасягнення адукацыйных мэт і ажыццяўлення вучэбнай камунікацыі. Структуру дадзеных рэсурсаў у адпаведнасці з бібліяграфічным падыходам складаюць масівы паршасных і другасных (рэфератыўная, аглядная, бібліяграфічная і фактаграфічная інфармацыя) дакументаў.

Адным з важных тэарэтычных пытанняў з'яўляцца вызначэнне функцый інфармацыйна-адукацыйных рэсурсаў мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства. Па-першае, для азначаных рэсурсаў характэрна функцыя інфармацыйнага забеспячэння сферы адукацыі, паколькі і рэсурсы мастацкай літаратуры, і рэсурсы літаратуразнаўства з'яўляюцца сродкам забеспячэння неабходнымі ведамі работнікаў адукацыйнай сферы: настаўнікаў, выкладчыкаў, а таксама сродкам навучання студэнтаў, вучняў агульнаадукацыйных школ, гімназій, ліцэяў, сярэдніх спецыяльных установ, у праграмы якіх уваходзіць вывучэнне мастацкай літаратуры. Яны даюць магчымасць гэтым катэгорыям карыстальнікаў знаходзіць для сябе матэрыялы, неабходныя для падрыхтоўкі і правядзення розных відаў вучэбных заняткаў.

Акрамя гэтага, для інфармацыйных рэсурсаў мастацкай літаратуры, якія выкарыстоўваюцца ў адукацыйным працэсе, характэрны эстэтычная, пазнавальная, адукацыйная, развіццёвая, выхаваўчая функцыі. Выконваючы эстэтычную функцыю, дадзеныя рэсурсы з'яўляюцца сродкам развіцця эстэтычнага густу і ідэалу, перадаюць абагульнены эстэтычны вопыт. Пазнавальная функцыя праяўляецца ў тым, што інфармацыйныя рэсурсы мастацкай літаратуры выконваюць ролю своеасаблівага сродка пазнання чалавека, яго псіхікі і навакольнага сусвету. Адукацыйная функцыя праяўляецца ў тым, што чытач навучаецца інтэлектуальнай і камунікатыўнай дзейнасці праз асэнсаванне, інтэрпрэтацыю прачытанага, абмеркаванне твораў, падчас якога набываюцца навыкі адстойвання свайго пункту гледжан-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ня, авалодвання літаратурнай мовай. Адбываецца навучанне эстэтычнаму ўспрыманню твораў і рэчаіснасці праз сістэму мастацкіх вобразаў. Сутнасць развіццёвай функцыі інфармацыйных рэсурсаў мастацкай літаратуры раскрываецца ў тым, што яны з'яўляюцца сродкам развіцця лагічнага і вобразнага мыслення, інтэлектуальных і творчых здольнасцей, што адбываецца праз інтэнсіфікацыю работы розуму ў працэсе чытання, аналітычнага асэнсавання зместу літаратурных твораў, абуджэння фантазіі. Выхаваўчая функцыя праяўляецца ў аказванні ўплыву на фарміраванне сістэмы маральных прынцыпаў, агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцей, нацыянальнай свядомасці і патрыятызму навучэнцаў.

Эстэтычную, адукацыйную і выхаваўчую функцыі выконваюць таксама і інфармацыйныя рэсурсы літаратуразнаўства, якія выкарыстоўваюцца ў працэсе навучання. Яны служаць сродкам замацавання ведаў аб эстэтычнай вартасці літаратурных твораў (эстэтычная функцыя), садзейнічаюць фарміраванню зацікаўленых, актыўных адносін чытача да літаратуры, патрэбнасці ў чытанні, навыкаў і ўменняў разбірацца ў змесце і сэнсе прачытаных твораў, разважаць над імі (выхаваўчая функцыя). Адукацыйная функцыя характэрна для вучэбных рэсурсаў літаратуразнаўства, у якіх зафіксаваны назапашаныя веды аб законах літаратурнай творчасці, мінулым літаратуры, яе сучасным стане, што садзейнічае фарміраванню навыкаў аналізу і ацэнкі літаратурных твораў і з'яў, павышэнню адукацыйнага ўзроўню карыстальнікаў, удасканаленню асобы.

Такім чынам, інфармацыйна-адукацыйныя рэсурсы публічных бібліятэк неабходна разглядаць як сістэму, якую ўтвараюць галіновыя інфармацыйна-адукацыйныя рэсурсы. Даволі значным элементам гэтай сістэмы з'яўляюцца інфармацыйныя рэсурсы мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства, якія выкарыстоўваюцца як сродак навучання ў працэсе адукацыйнай дзейнасці навучальных устаноў. Пры вызначэнні дэфініцыі, функцый і іншых тэарэтычных пытанняў азначаных галіновых інфармацыйна-адукацыйных рэсурсаў патрэбна ўлічваць спецыфіку мастацкай літаратуры як віду мастацтва і літаратуразнаўства, як навукі.

1. *Раманава, Ж. Л.* Інфармацыйныя рэсурсы беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства: тэарэтыка-метадычны аспект : аўтарэф.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дыс. …канд. пед. навук : 05.25.03. / Ж. Л. Раманава ; Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск, 2015. – 25 с.

2. *Юхнавец, Т. С.* Адукацыйныя інфармацыйныя рэсурсы: да пытання вызначэння сутнасці / Т. С. Юхнавец // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – 2014. – № 2 (22). – С. 103–110.

***Р. А. Ровина,*** *кандидат педагогических наук, доцент, заведующий кафедрой информационных ресурсов;*

***М. Ю. Потапчук,*** *выпускница факультета информационно-документных коммуникаций*

# МЕСТО ИНФОРМАЦИОННЫХ РЕСУРСОВ ОТРАСЛЕВЫХ БИБЛИОТЕК В НАУЧНО-ОБРАЗОВАТЕЛЬНОМ ПРОСТРАНСТВЕ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Информационные ресурсы отраслевых библиотек Республики Беларусь составляют определенную совокупность, которую возможно дифференцировать по различным аспектам. Библиографическая продукция традиционного характера представлена отраслевыми, многоотраслевыми, тематическими, межотраслевыми указателями по различным вопросам научно-технической и медицинской сферы (НТиМС). Для библиографических ресурсов отраслевых библиотек республики характерно наличие указателей, отражающих отдельные виды документов, содержание периодических изданий (журналов). На современном этапе значительный удельный вес принадлежит библиографическим указателям персонального характера, посвященных как выдающимся ученым, так и отражению работ научно-исследовательских учреждений и высших учебных заведений.

Библиографические ресурсы НТиМС направлены на информационное обеспечение научной, производственной, образовательной деятельности, что свидетельствует о том, что они используются для удовлетворения профессиональных информационных потребностей. И особое место среди них занимают проблемно-ориентированные библиографические пособия, тематика которых, как правило, связана с выполнением комплексных, межотраслевых исследований, а подготовка их требует не только профессиональных, но и прикладных, связанных с темой, знаний. На современном этапе все большее место